зай літаратурай, задавальненне ўзрастаючага інтарэсу да нацыянальнай гісторыі і культуры, пашырэнне аперацыяльных магчымасцей для мадэліравання сітуацый свабоднага агульнаарыентаванага пошуку. Не маючы магчымасці стварыць аб'ёмныя новыя жанры дапаможнікаў: энцыклапедыі, анталогіі і інш – бібліёграфы НББ унеслі значныя змяненні ў свае галоўныя традыцыйныя выданні «Новыя кнігі Беларусі», «Беларуская мова, літаратура, мастацтва». У «Новых кнігах Беларусі» аператыўна адлюстроўваюцца бібліяграфічныя дадзеныя аб апублікаваных кнігах, артыкулах, рэцэнзіях. Асаблівую каштоўнасць у раздзеле «Навінкі беларускага друку» ў бюлетэні «Новыя кнігі Беларусі» ўяўляе першая частка «Пра Беларусь і беларусаў». Гісторыка-храналагічная структура гэтай часткі і шырокае выкарыстанне анатацый забяспечваюць даступнасць інфармацыі, аблягчаюць пытанне выбару. Фактаграфічная дакладнасць анатацый (пра каго, дзе і калі адбыліся падзеі) -- гэта тыя галоўныя пазнавальныя элементы, якія акцэнтуюць увагу чытачоў. З мэтай аптымізацыі інфармацыйнага пошуку па нацыянальнай праблематыцы ўведзены гадавыя дапаможныя паказальнікі да раздзела «Пра Беларусь і беларусаў»: персанальны, геаграфічны, прадметна-тэматычны. Іх інфарматыўнасць, асабліва персанальнага, значна пераўзыходзіць традыцыйную айчынную методыку складання дапаможных паказальнікаў. Выкарыстанне гэтых дапаможных паказальнікаў надзвычай карысна для фарміравання краязнаўчых бібліяграфічных элементаў у публічных бібліятэках. Станоўчыя водгукі выклікае групоўка матэрыялу ў раздзеле «Навінкі беларускага друку» згодна з тыповым чытацкім запытам, што адпавядае асаблівасцям інфармацыйных паводзін чытачоў пры выбары літаратуры для непрафесійнага чытання. Тэматыка раздзелаў «Памятныя даты», спісаў і аглядаў, якія змяшчаюцца ў бюлетэні, прысвечана самым яркім старонкам мінуўшчыны і сучасным актуальным праблемам. Гэта дапамагае задавальняць інтарэсы чытачоў у галіне нацыянальнай культуры, адраджэння, гісторыі, па маральна-этычных і эканамічных праблемах. Для стварэння ўмоў свабоды індывідуальнага выбару з улікам спектру пабуджальных матываў да чытання: пазнавальных, прэстыжных і іншых -- бібліёграфы пашырылі склад уключаемых дакументаў. Цяпер бібліяграфуюцца крыніцазнаўчыя матэрыялы, у тым ліку на замежных мовах, публікацыі мінулых гадоў. Накіруннак асветніцтва і папулярызацыі яскрава выяўляецца ў шырокім скарыстанні даведачных і пазнавальных звестак як з мэтай садзейнічаць семантычнаму засваенню бібліяграфічных паведамленняў, так і для стымулявання цікавасці, займальнасці, гэта, ў сваю чаргу са-дзейнічае чытацкаму выбару. Пазнавальная і фактагра-фічная інфармацыя, якую ўключаюць у тэксты рэкамендацыйна-бібліяграфічных дапаможнікаў: эпіграфы, цытаты, імёны, геаграфічныя аб'екты, даты, звесткі аб падзеях і інш. -- у сінтэзе з элементамі займальнасці ўзбагачае інфармацыйны запас чытача і забяспечвае даступнасць бібліяграфічных мадэляў твораў друку.

Кобер Т.К.,
аспірантка

## ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ ЯДРА БІБЛІЯТЭЧНАГА ФОНДУ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Адной з важнейшых праблем развіцця фонду дзіцячых бібліятэк Беларусі з'яўляецца стварэнне яго ядра. Але на гэтым шляху існуе шэраг цяжкасцей. Само паняцце «нацыянальны фонд» мае некалькі сэнсаў:

– сукупнасць выданняў, што выйшлі на тэрыторыі рэспублікі;

– сукупнасць выданняў, што выйшлі на нацыянальнай мове (без уліку перакладаў);

– сукупнасць выданняў, аўтары якіх жывуць на тэрыторыі рэспублікі;

– сукупнасць выданняў, аўтары якіх -- прадстаўнікі пэўнай нацыянальнасці.

Таксама на сённяшні момант нельга сказаць, што ядро бібліятэчнага фонду нацыянальнай літаратуры для дзяцей усебакова адлюстроўвае з'явы грамадскага жыцця, навукі, тэхнікі, якія адбываюцца на Беларусі. Калі яго мастацкую частку можна лічыць сфарміраванай (у яе ўваходзіць літаратура ўсіх жанраў, яна адлюстроўвае этапы развіцця мастацкага слова ў рэспубліцы), то галіновая частка ўяўляе сабой асобныя фрагменты. Так, немагчыма ўключыць у ядро літаратуру па біялогіі і геаграфіі з элементамі фальклору (легенды пра назвы азёраў і рэчак, цікавыя звесткі пра жывёл) для малодшага школьнага ўзросту. На сённяшні дзень юныя чытачы не могуць пазнаёміцца з творамі, якія распавядалі б пра карысныя выкапні на тэрыторыі рэспублікі і ўключалі звесткі пра іх здабычу, выкарыстанне, значэнне для чалавека.

Немагчыма парэкамендаваць для ўключэння ў ядро фонду кніг пра транспарт, энергетыку, розныя галіны вытворчасці Беларусі, якія б зацікавілі малодшых школьнікаў. Ядру неабходна літаратура пра прафесіі, напісаная ў жанры белетрыстыкі (напрыклад, гульня ў краму, бібліятэку).

Такое ж становішча з галіновай часткай ядра фонду нацыянальнай літаратуры для чытачоў старэйшага школьнага ўзросту. Акрамя тэм, пра якія гаварылася вышэй, амаль няма кніг пра беларускіх мастакоў, кніг-вандровак па беларускіх музеях, папулярных нарысаў пра вядомых скульптараў. Старэйшым школьнікам няма дзе пачытаць пра знакамітых беларускіх мовазнаўцаў і збіральнікаў фальклору, азнаёміцца з узорамі іх творчасці.

Адна з найбольшых лакун у сённяшнім складзе ядра -- гістарычная тэма. Нягледзячы на вялікую патрэбу, пакуль што няма такіх кніг, што асвятлялі б жыццё на Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён. Патрэбна выданне энцыклапедычнага даведніка



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пра рэспубліку альбо энцыклапедыі па тыпу «Што такое? Хто такі?», заснаванай на беларускім матэрыяле.

Каб палепшыць становішча з фарміраваннем ядра фонду нацыянальнай літаратуры для дзіцячых бібліятэк, патрэбна:

– удакладніць паняцце «нацыянальнае бібліятэчнае ядро» з мэтай вызначэння літаратуры, што павінна ўваходзіць у яго;

– метадыстам Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь вызначыць шэраг тэм (сумесна з супрацоўнікамі абласных бібліятэк, ЦБС, навукоўцамі), літаратуру па якіх неабходна мець у складзе ядра;

– уносіць адпаведныя прапановы па выпуску такіх твораў у выдавецкія структуры, пісьменніцкія, творчыя саюзы, навуковыя установы.

Пяўлава С.А.,
канд. філал.навук,
дацэнт

## АСАБЛІВАСЦІ МІЖАСАБОВЫХ ЧЫТАЦКІХ ЗНОСІН ПАДЛЕТКАЎ З ДАРОСЛЫМІ

Развіццё, фарміраванне, выхаванне асобы здзяйсняецца ў складанай сістэме ўзаемасувязей з грамадствам, з асяроддзем, у якім знаходзіцца падлетак. Вялікі ўплыў на падлеткаў аказваюць дарослыя. Далучэнне падлеткаў да культуры сродкамі чытання адбываецца ў працэсе жыццядзейнасці тых выхаваўчых калектываў, членамі якіх яны з'яўляюцца, у першую чаргу сям'і, школьнага класа, што аб'ядноўвае не толькі навучэнцаў, але і педагогаў, а таксама калектыву чытачоў кожнай канкрэтнай бібліятэкі.

Характарыстыка міжасабовых чытацкіх зносін падлеткаў з дарослымі дадзена на падставе аналізу наступнай інфармацыі: а) дадзеных аб арыентацыі падлеткаў на дарослых як на аўтарытэт у чытанні; б) асноўных характарыстык міжчытацкіх зносін з настаўнікамі, бібліятэкарамі, бацькамі.

Падлеткі адчуваюць патрэбнасць у міжчытацкіх зносінах з дарослымі. Да гэтых зносін яны прад'яўляюць пэўныя патрабаванні: жыццёвы вопыт, добры чытацкі густ, уменне расказаць аб кнізе або артыкуле, быць у курсе інтарэсаў падлеткаў. Характар міжчытацкіх зносін залежыць ад таго, з кім з дарослых кантактуе падлетак. Так, з настаўнікамі і бібліятэкарамі пераважаюць інфармацыйныя і рэгулятыўныя віды зносін. З бацькамі часцей за ўсё падлеткі імкнуцца ўстанавіць эмацыянальнае чытацкае ўзаемадзеянне.

Магчымая ўзаемасувязь міжчытацкіх зносін з дарослымі значна парушана таму, што дарослыя не могуць наладзіць чытацкія кантакты з падлеткамі.

Намаганні дарослых па развіццю чытацкіх якасцей падлеткаў у значнай меры аказваюцца неэфектыўнымі таму, што існуе слабая ўзаемасувязь настаўнікаў, бібліятэкараў, бацькоў, а таксама няма каардынацыі ў планаванні работы школы і бібліятэкі.

Дрыга І.У.,
саіскальнік

## НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ БЯГУЧАЙ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ ПА МАСТАЦТВУ НА БЕЛАРУСІ

Бягучае бібліяграфаванне ахоплівае асноўныя часткі дакументальнага патоку: творы і выданні твораў мастацтва і літаратуру па мастацтву РБ.

Сярод твораў мастацтва найбольш поўна і дакладна арганізаваны ўлік асноўных выданняў выяўленчага мастацтва і нот. Тыя з гэтых дакументаў, што выдадзены на Беларусі, рэгіструюцца на старонках адзінага дзяржаўнага бібліяграфічнага паказальніка «Летапіс друку Беларусі». Выданні нотнай і выяўленчай беларусікі блізкага і далёкага замежжа адлюстроўваюцца ў асобнай яго частцы «Беларусь у друку за-межных краін» у спецыяльных раздзелах. Бягучае бібліяграфаванне фоназапісаў, кіна- і відэафільмаў атрымала меншае развіццё. Існуючыя крыніцы (напрыклад, штомесячная інфармацыя аб фільмах, дапушчаных да пракату экспертнай камісіяй Дзяржаўнага рэгістра кіна-, відэафільмаў і кіна-, відэапраграм, фона- і фільмаграфічныя публікацыі на старонках часопісаў і газет і інш.) разлічаны ў асноўным на патрэбы кінапракату ці рэкламы новых фона- і кіна, відэадакументаў і не забяспечваюць належнага адлюстравання перш за ўсё нацыянальнага дакументальнага патоку па гэтых відах.

Стварэнне бягучай бібліяграфічнай інфармацыі аб літаратуры па мастацтву на сігнальным, рэфератыўным і аглядным узроўнях забяспечваецца сеткай органаў навуковай інфармацыі па культуры і мастацтву на чале з аддзелам навуковай інфармацыі па культуры і мастацтву (АНІКМ) Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і аддзелам навуковай інфармацыі па гуманітарных навуках Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

АНІКМ Нацыянальнай бібліятэкі стварае шэраг бібліяграфічных і фактаграфічных выданняў. Сярод першых вылучаюцца сігнальныя (штомесячныя «Новая літаратура па культуры і мастацтву Беларусі», штотыднёвая «Сігнальная інфармацыя», «Сістэматычны паказальнік неапублікаваных дакументаў па культуры і мастацтву» – 2 разы ў год) і аглядныя («Аператыўная інфармацыя па культуры і мастацтву» – 6 разоў у год) крыніцы. Фактаграфічныя звесткі прадстаўлены штомесячнай хронікай падзей «Культурнае жыццё Беларусі» і зборнікам «Асноўныя службовыя даку-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ